*А.В.КАЛАШНІКАВА*

# ТЭАТР ЛЯЛЕК У ІНДУСТРЫІ АДПАЧЫНКУ

*Разглядаюцца разнастайныя шляхі ўключэння традыцыйных і новых формаў лялечнага тэатра ў сацыякультурнае асяроддзе. Паказана, як сінтэтычная прырода тэатра лялек актыўна і разнастайна выкарыстоўваецца ў сучаснай індустрыі адпачынку, вызначаюцца новыя напрамкі для развіцця розных формаў мастацтва лялечнага тэатра ва ўмовах сучаснай сістэмы творчых і арганізацыйна-эканамічных зносін.*

Даследаванне тэатра як структурнага элемента ў дынаміцы грамадскага і мастацкага развіцця з'яўляецца адной з важнейшых задач сучаснага тэатразнаўства. Сацыяльнае фунцыянаванне беларускага тэатра аналізуецца ў манаграфічных працах Т.Гаробчанкі, М.Каладзінскага, А.Лабовіча, В.Навуменкі, У.Няфёда, А.Сабалеўскага, Р.Смольскага, Р.Бузука. Даследчыкі адзначаюць, што спецыфіка функцыянавання беларускага тэатра лялек павялічвае прасторавую панараму культурнай рэальнасці. Багаты фактаграфічны матэрыял, што датычыцца мастацтва тэатра лялек, змешчаны ў працах Г.Барышава і А.Саннікава, М.Каладзінскага, у рэспубліканскіх міжведамасных зборніках "Пытанні мастацтва і культуры Беларусі" (1988–1993), энцыклапедычных выданнях "Гісторыя беларускага тэатра", "Тэатральная Беларусь".

Ва ўмовах, калі пад уплывам сродкаў масавай інфармацыі, навукова-тэхнічнага прагрэсу, узаемапранікнення культур нараджаюцца новыя віды культурнай дзейнасці і формы культурнага спажывання, гэты від традыцыйнага мастацтва апынуўся перад неабходнасцю выявіць свае магчымасці ў сучасным канкрэтным існаванні, каб не толькі захаваць сябе, а і ўпісацца ў новую сацыяльна-культурную прастору. У артыкуле мы спрабуем асэнсаваць пытанне сацыяльнай ролі тэатра лялек у сучаснай навуцы і практыцы.

Сінтэтычная прырода тэатра лялек актыўна і разнастайна выкарыстоўваецца сёння ў індустрыі адпачынку. Удзел тэатра лялек у культурна-займальных праграмах заўсёды ўпрыгожвае відовішчнае дзеянне, надае непаўторнасць і своеасаблівасць любому святу. Магчымасці тэатра лялек традыцыйна выкарыстоўваюцца ў арганізацыі дзіцячага адпачынку. З пункту гледжання менеджэраў сацыякультурнай дзейнасці тэндэнцыю да развіцця захавалі наступныя напрамкі:

- выязныя лялечныя спектаклі;
- лялечныя гурткі;
- укараненне разнастайных формаў тэатра лялек (тэатр марыянетак, пальчатачны тэатр, планшэтныя лялькі, роставыя лялькі і інш.) у сямейны адачынак;
- гульнявыя праграмы з удзелам лялек у спецыялізаваных дзіцячых клубах, парках;
- стварэнне невялікіх груп лялькаводаў і арыгінальных лялек з мэтай удзелу ў рэкламных і ПР акцыях;
- прадзюсіраванне лялечнікаў з арыгінальнымі нумарамі на розных узроўнях: лялечныя паказы ў начных клубах, на эстрадзе, у тэлевізійных перадачах, тэлешоу і г.д;
- арганізацыя фестываляў тэатраў лялек.

Жанравая разнастайнасць театра лялек дазваляе шырока выкарыстоўваць патэнцыял лялечнага тэатра ў індустрыі адпачынку і магчымасці яго пазіцыянавання ва ўмовах арт-рынку. Гэты тэатр можа заняць сваё пачэснае мэсца ў сацыякультурным праектаванні развіцця малых гарадоў і вёсак, стаць састаўной часткай турыстычных праграм.

Дзякуючы сваёй мабільнасці, відовішчнасці і яскрава выражанаму забаўляльнаму характару, народны лялечны тэатр карыстаўся незвычайнай папулярнасцю на тэрыторыі Беларусі ў дарэвалюцыйны час. Кожны батлеечнік сам ствараў сваіх лялек, беражна перадаючы іх у спадчыну. Гэта дапамагло захаваць лялькі і скрыні да нашых дзён і прадэманстраваць сёння непаўторную самабытнасць кожнага аўтарскага варыянта. Батлеечныя лялькі, своеасаблівыя па сваім знешнім выглядзе і мастацкай вартасці, можна ўбачыць у экспазіцыі многіх беларускіх музеяў.

Але тэатральная лялька сама па сабе – малавыразны экспанат. Па-сапраўднаму яна раскрываецца толькі ў працэсе творчай работы і камунікацыі з гледачом. Канцэпцыя "жывыя экспанаты" ляжыць у аснове дзейнасці Зальцбургскага музея лялькі. Штогод у музеі адбываецца фестываль лялечных тэатраў, дзе лялькі-экспанаты становяцца дзеючымі персанажамі тэатральных спектакляў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дом-музей творчасці беларускага паэта М.Багдановіча ў Мінску з дапамогай батлеечнага тэатра ўзмацніў цікавасць наведвальнікаў да ўласнай экспазіцыі. Паўгадзінны спектакль, які ладзіць пасля экскурсіі нешматлікі персанал музея, прыцягвае аматараў этнаграфіі, школьнікаў, студэнтаў, бацькоў з дзецьмі. Відавочная эканамічная эфектыўнасць новаўвядзення: уваходны білет з лялечным паказам каштуе даражэй за звычайны.

Гэтая ініцыятыва была падхоплена Музеем гісторыі тэатральнай і музычнай культуры, нядаўна адкрытым у Мінску (2004). У адной з яго залаў дэманструюцца розныя віды батлеечных тэатраў. Па жаданні групы наведвальнікаў-экскурсантаў паказваецца батлеечны спектакль з тымі ж лялькамі і скрынямі, якія бачылі нашы продкі ў XVIII–XIX стст. Акрамя таго, у музеі была арганізавана выстава, прысвечаная сцэнаграфіі тэатра лялек (09.2004), дзе можна было пазнаёміцца з самымі цікавымі лялькамі з вядомых спектакляў: “Дзед і Жораў”, “Сымон-музыка”, “Ляўша”, “Майстар і Маргарыта” і інш. Дарэчы, многія лялькі з гэтых спектакляў прадаўжаюць сваё сцэнічнае жыццё ў рэпертуары Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек.

Наогул прафесійныя тэатры лялек не губляюць цікавасці да вытокаў свайго мастацтва. Спектакль Брэсцкага тэатра лялек “Рыгорка – ясная зорка” (рэж. А.Жугжда), які звыш дванаццаці гадоў уваходзіць у рэпертуар тэатра, зроблены ў традыцыях народнага батлеечнага тэатра з уласцівымі яму спевамі, выслоўямі, іншымі аўтэнтычнымі дэталямі, атрымаў спецыяльны прыз IX Міжнароднага тэатральнага фестывалю “Белая вежа – 2004”. Доказам жыццяздольнасці батлейкі як самабытнай часткі беларускай тэатральнай культуры з’яўляецца сёння дзейнасць Мінскага абласнога тэатра “Батлейка”, які прадаўжае і развівае традыцыі старажытнага народнага лялечнага тэатра Беларусі.

Розныя формы гэтага жанру могуць служыць вытокамі сямейнага бізнесу, ён актыўна развіваецца ў сістэме заходняга шоу-бізнесу і культурнага турызму. Так, спектаклі, створаныя сямейным тэатрам лялек Анн і Хэнк Бурвіль у Галандыі, карыстаюцца такой папулярнасцю, што паглядзець спектаклі лялечнікаў імкнуцца гледачы з ўсяго свету. Аншлагам суправаджаліся выступленні артыстаў з Галандыі на міжнародных фестывалях тэатраў лялек, якія праходзілі ў Мінску ў 90-я гг. мінулага стагоддзя.

Лепшымі пастаноўкамі IX Міжнароднага тэатральнага фестывалю “Белая вежа – 2004” былі пастаноўкі, паказаныя французскім лялечнікам – “чалавекам-аркестрам”. З далоні на далонь гледачоў у тэатральнай зале “пералятала” маленькая лялечная балерына, падпарадкоўваючыся віртуознаму майстэрству акцёра-лялечніка Андраса Ленарда. А біблейская гісторыя пра Адама і Еву ў спектаклі “Кананіма” была расказана акцёрам сродкамі мініяцюрнага тэатра лялек у прамым сэнсе на стале (некаторыя лялькі здолелі памясціцца нават ў карабку для запалак).

На X Міжнародным тэатральным фестывалі “Белая вежа – 2005” стала відавочным, што лялечны тэатр сфарміраваў своеасаблівую эстэтыку сцэнічнага існавання акцёра ў гэтым тэатры. Смелыя эксперыментальныя пастаноўкі (такія, напрыклад, як “Неба ў чамадане, альбо Цуцыкі ўначы”) паказалі, што нават пры адсутнасці лялек на сцэне спектакль можа застава́цца лялечным па сваёй сутнасці (людзі рухаюцца і існуюць, як лялькі). Узбагачаецца эстэтыка тэатра, і няспынна паглыбляецца філасофія лялечных спектакляў. Стылізаваная пад рух лялькі пластыка ў чалавечым жыцці не існуе, яна ўтвараецца акцёрамі, якія выходзяць на сцэну і робяць яе з дапамогай свайго цела.

Сёння ў рэспубліцы працуюць 10 прафесійных дзяржаўных тэатраў лялек, якія выпускаюць у сярэднім 18 новых пастановак у год і абслугоўваюць прыкладна за гэты час 520 тыс. чалавек (згодна статыстычных даных на адным спектаклі ў сярэднім прысутнічаюць каля 260 гледачоў, а сярэдняя колькасць спектакляў на адзін тэатр у год складае звыш 200) [5, с.41]. Разглядаючы дынаміку развіцця тэатральнага мастацтва ў рэспубліцы, тэатразнаўцы адзначаюць “надзвычай цікавую працу сучаснага тэатра лялек нашай краіны, адметнымі рысамі якога з’яўляюцца паглыблены пошук новых выяўленчых сродкаў, формаў, шырокае выкарыстанне выяўленчых сродкаў іншых відаў мастацтваў” і канстатуюць “з’яўленне новага віртуальнага тэатральнага феномена” [3, с.126]. Даследчыкамі адзначаецца, што неабходна замацаваць і развіваць у сацыякультурным асяроддзі гэты від мастацтва, які сёння знаходзіцца на еўрапейскім узроўні.

Традыцыя лялечных фестываляў у Беларусі была закладзена яшчэ ў савецкі час. У 90-я гг. XX ст. у Мінску з вялікім поспехам праводзіліся міжнародныя фестывалі тэатраў лялек, якія станоўча адбіліся на развіцці гэтага мастацтва і тэатральнай культуры рэспублікі. Па-першае, фестывалі садзейнічалі папулярнасці мастацтва тэатра лялек у гледача. У нейкай ступені яны абаранілі гэты тэатр ад крызісу, у якім апынуліся іншыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

віды тэатральнага мастацтва ў перабудовачны перыяд з-за адсутнасці цікавасці гледача да тэатра. Па-другое, актыўна спрыялі пошуку нацыянальнай адметнасці. Тэатр заняў сваё месца ў культурнай разнастайнасці свету, аб чым сведчаць шматлікія ўзнагароды, атрыманыя на замежных фестывалях нашымі лялечнымі тэатрамі, менавіта за спектаклі па п‘есах беларускіх драматургаў (напрыклад, пастаноўка Дзяржаўнага тэатра лялек РБ “Дзед і Жораў” рэжысёра А.Ляляўскага па п’есе У.Вольскага). Па-трэцяе, беларускае мастацтва тэатра лялек ў кантэксце фестывальнага руху паўстае як дынамічныя структура, якая мяняецца і развіваецца ў разнастайных кірунках. Пры гэтым менавіта фестывалі, творчыя тэндэнцыі заходніх тэатраў прымусілі больш уважліва адносіцца да спецыфікі тэатра лялек. Сёння гэты тэатр, які вызначае сябе не толькі як дзіцячы тэатр, а як тэатр для ўсіх, стаў актыўна ўдзельнічаць у выхаванні сацыяльнай актыўнасці гледеча і фарміраванні прынцыпаў талерантнасці ў грамадстве, выкарыстоўваць новыя формы камунікацый з аўдыторыяй.

Мастацтвазнаўчы аналіз вопыту фестывальнага руху тэатраў лялек у Беларусі паказвае, што фестываль як творчая лабараторыя спрыяў разнастайнасці сцэнічных пошукаў, і гэта выявілася ў мнагавектарным аднаўленні рэпертуару:

– засваенні нетрадыцыйнай для тэатра лялек драматургіі,

– звароце да больш шырокага кола тэм, іх сацыяльнай значнасці;

– з’яўленні пастановак у новых жанрах (містэрыя, кантата, маралітэ і інш.) і пераасэнсаванні казачных сюжэтаў і вядомай драматургіі тэатра лялек;

– папаўненні рэпертуару новымі творамі беларускіх аўтараў і росту цікавасці маладых драматургаў да тэатра. Дарэчы, стымуляванню гэтай цікавасці спрыяе конкурс, аб’яўлены Беларускім інстытутам павышэння кваліфікацыі работнікаў культуры на лепшую п’есу для тэатра лялек (2006).

Змяніўся канцэптуальны падыход да тэатральнага твора. Глядач – гэта сатворца спектакля. Тэатр не дае гатовых рэцэптаў; дамысліць сюжэт, зрабіць вывад – гэта прэрагатыва гледача. З’явіліся спектаклі мнагапланавыя па сваёй сэнсавай змястоўнасці, яны цікавыя і для дзяцей, і для дарослай аўдыторыі. Усё гэта абумовіла новыя прыёмы зносін з аўдыторыяй: вынас сцэнічнага дзеяння ў глядзельную залу; малыя формы тэатра (настольны тэатр, тэатр батлейкавага тыпу і інш.), якія аднавілі камернасць тэатральнай атмасферы і дазволілі весці даверны, амаль інтымны дыялог з гледачом.

У пошуку сучасных формаў камунікацыі з гледачом тэатр выходзіць у віртуальную прастору. Напрыклад, сайт *www.puppet-minsk.com* знаёміць з навінамі і гісторыяй Дзяржаўнага тэатра лялек РБ. Станаўленне арт-рынку запатрабавала новых падыходаў да сістэмы фінансавання і функцыянавання тэатраў лялек. Назіраецца новы этап эвалюцыі творчай і арганізацыйна-эканамічнай структур тэатра, узмацняецца роля прадзюсерства ў сферы тэатральнага мастацтва. На гэтым шляху вопыт, атрыманы ў працэсе арганізацыі фестывальных кантактаў, мае важнае значэнне.

Сёння калектывы лялечных тэатраў рэспублікі з’яўляюцца нязменнымі ўдзельнікамі тэатральнага фестывалю “Белая вежа”, куды таксама прыязджаюць лялечнікі з Польшчы, Германіі, Украіны, Расіі. Беларускія тэатры лялек шырока вядомыя за межамі рэспублікі. Толькі за 2004 г. Гродзенскі абласны тэатр лялек з поспехам прыняў удзел у фестывалях у Літве, Польшчы, Расіі, Харватыі і атрымаў 8 дыпломаў за спектакль рэжысёра А.Жугжды “Паэма без слоў” на тэкст Я.Купалы. Брэсцкі абласны тэатр лялек удзельнічаў у фестывалях у Маскве, Львове, Хмяльніцкім; Мінскі абласны тэатр “Батлейка” – на фестывалях у Субоціцы (Сербія), Луцку, Івана-Франкоўску (Украіна); Дзяржаўны тэатр лялек РБ – у Германіі (Магдэбург, Бон), Расіі (Санкт-Пецярбург, Разань); тэатр “Лялька” – у Германіі (Франкфурт-на-Одэры) [1, с. 91].

Вопыт фестываляў у Беларусі і за яе межамі паказвае, што, дзякуючы мэтанакіраванай рэкламе, фестывалі тэатраў лялек могуць стаць прыбытковым камерцыйным праектам. Відовішчы з удзелам лялек маюць магутны рэкламны патэнцыял. Магчымыя арганізацыя выставачнага перформанса з удзелам лялек, прыцягненне жанру ў прэзентацыйную дзейнасць сацыякультурнай сферы, рэкрэацыйную, адукацыйную і інш. Лялечныя фестывалі – гэта публічнае дзеянне, гатовы рэкламны прадукт, з дапамогай якога можна:

– фарміраваць гандлёвыя маркі (брэнды);

– рэкламаваць тавары і камерцыйныя фірмы;

– прыцягваць турыстаў у месцы правядзення фестываляў;

– фарміраваць імідж палітычных дзеячаў, партый, грамадскіх рухаў, арганізацый;

– фарміраваць імідж рэгіёну, горада;

– пераўтвараць гарадское асяроддзе, звяртаць увагу на праблемы экалогіі, грамадства;

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

– фарміраваць культурныя патрэбы наведвальнікаў фестываляў.

Існуюць яшчэ і дадатковыя магчымасці:

– запіс спектакляў на відэаносьбіты і лічбавыя носьбіты для тыражавання, продажу, віртуалізацыі (кансервацыя для гісторыі, адаптацыя для СМІ, рэкламы, крэатыўная апрацоўка сцэнічных твораў);

– продаж трансляцыі па тэлебачанні, для стварэння сайтаў;

– відэападборка з папярэдніх фестываляў можа прадавацца разам з іншай сувенірнай прадукцыяй;

– стварэнне цыкла тэлеперадач для дзяцей на аснове фрагментаў спектакляў;

– прадзюсіраванне і падтрымка нацыянальнай мультыплікацыі і брэндаў мультыплікацыйных персанажаў;

– прасоўванне маладых артыстаў і тэатральных калектываў.

Пашырыць патэнцыяльную аўдыторыю фестываляў можна за кошт продажу білетаў на фестывальныя мерапрыемствы ў якасці дадатковай паслугі да турыстычных маршрутаў, якія ўжо існуюць. У пуцёўку могуць быць уключаны сустрэчы з удзельнікамі фестываляў, наведванне гістарычных мясцін і інш. Менеджэрам такіх фестываляў трэба ўлічваць, што гэтыя мерапрыемствы публічныя і актыўна нясуць пэўную PR інфармацыю, яны пажаданыя для спонсараў, рэкламадаўцаў, фондаў. Такія фестывалі аб'ядноўваюць людзей, робяць больш лёгкімі кантакты, ствараюць святочную, натуральную атмасферу, што з'яўляецца велізарным камунікатыўным рэсурсам.

Лялечны тэатр, спецыфічнасць яго прыроды, сінтэтычнасць выразных сродкаў патрабуюць сёння добрага пазіцыянавання на сучасным арт-рынку. У сучаснай індустрыі адпачынку ўсё большую папулярнасць заваёўваюць велізарныя надзьмутыя канструкцыі. Пнеўматычныя лялькі-касцюмы з поспехам могуць быць выкарыстаны ў рэкламным бізнесе, для цікавага праекта, які патрабуе стварэння эфектнага шоу пад адкрытым небам. Бізнес пнеўматычных атракцыёнаў актыўна развіваецца ў сучаснай індустрыі адпачынку, і павялічваецца колькасць фірмаў-вытворцаў пнеўматычных лялек.

Практычная рэалізацыя сучаснай сацыякультурнай дзейнасці патрабуе новых падыходаў да прафесійнага навучання студэнтаў – будучых менеджэраў сацыякультурнай дзейнасці. Праграма падрыхтоўкі менеджэраў у БДУ культуры і мастацтваў накіравана на азнаямленне будучых спецыялістаў з шырокім спектрам выразных сродкаў і тэатральных формаў, якія выкарыстоўваюцца ў сучасным відовішчным мастацтве і культурна-займальных праграмах [2, с. 3]. Інфармацыя, што атрымліваюць студэнты на занятках, абавязкова падаецца праз прызму будучай прафесійнай дзейнасці.

Стварэнне сцэнарнага плана мерапрыемстваў, акцый, прэзентацый, рэкламнага перформанса з прымяненнем выразных сродкаў тэатра лялек, стварэнне лялечных нумароў у працэсе заняткаў па рэжысуры культурна-займальных праграм, праекта рэгіянальнага лялечнага фестывалю на аснове практыкі тэатра лялек – усё гэта можа быць карысным для прафесійнай арыентацыі будучых менеджэраў сацыякультурнай дзейнасці, папулярызацыі мастацтва беларускага лялечнага тэатра.

Такім чынам, беларускі тэатр ва ўмовах сучаснай сістэмы творчых і арганізацыйна-эканамічных зносін мае вялікі рэкламны і камунікатыўны патэнцыял, робіць відовішчы з удзелам лялек у сферы індустрыі адпачынку займальнымі і карыснымі. Для рэалізацыі свайго патэнцыялу беларускі лялечны тэатр патрабуе добрай сацыяльнай і камерцыйнай рэкламы, падтрымкі і папулярызацыі як від мастацтва і як складаючая індустрыі адпачынку, а таксама кваліфікаваных кадраў, якія маглі б паспрыяць развіццю яго дзейнасці ў сацыякультурнай прасторы па ўсіх кірунках.

1. *Беларуская* культура: вопросы и ответы: информ. сб. Ч.I / науч. ред. В.П.Скороходов. – Мн.: БелДІПК, 2002.

2. *Драматургія* і рэжысура культурна-адпачынкавых праграм: праграма курса для студэнтаў-менеджэраў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры / С.Б.Майсяйчук, У.У.Гідлеўскі.– Мн.:БДУ культуры, 2003.

3. *Скараходаў, У.П.* Сацыядынаміка культуры сучаснай Беларусі / У.П.Скараходаў.– Мн.: БелДІПК, 2003.

4. *Тульчинский, Г.Л.* Менеджмент в сфере культуры / Г.Л.Тульчинский. – СПБ.: Лань, 2001.

5. *Функцыяніраванне* і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь да 2005 года: дзяржаўная праграма. – Мн.: БелДІПК, 2002.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Матэрыялы сайтаў:*
www.artlife.by
www.artmanagement.org
www.puppet-minsk.com
www.kulturmanagement.net

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ